# Аранжавы ўзровень небяспекі аб’яўлены ў Беларусі 7 чэрвеня з-за навальніц

Аранжавы ўзровень небяспекі аб’яўлены ў Беларусі 7 чэрвеня з-за навальніц, паведамілі БЕЛТА ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.
У панядзелак будзе пераменная воблачнасць. Ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, чакаюцца навальніцы. Днём пры навальніцах месцамі прагназуюцца град і моцныя ліўні. Вецер паўночны ўмераны, пры навальніцах парывісты, днём у асобных раёнах будзе шквалістае ўзмацненне ветру.

Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 10-16. Днём будзе 21-27 градусаў цяпла.

БЕЛТА